и Олимпийских играх. Всё это так же нашло отражение в экспозициях музея.

Таким образом, экспозиции музея истории дают представление о создании, многогранной деятельности ВУЗа, его вкладе в развитие сельскохозяйственного производства республики.

УДК 94 (476) «1921/1939»

# МЯСТЭЧКА ГАРАДНАЯ – "ЗАПАВЕДНІК ГАНЧАРСТВА" НА ПАЛЕССІ Ў 1921-1939 гг.

**Г.С. Вайцешчык**
УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У навуковым артыкуле аўтарам аналізуюцца ўмовы і асаблівасці развіцця ганчарнага промыслу ў мястэчку Палескага ваяводства. У Гарадной ганчарная вытворчасць не прыпынялася на працягу некалькіх стагоддзяў і стала патомным заняткам для многіх яго жыхароў. Даследванне з'яўляецца вынікам крытычнага аналізу аўтарам прац айчынных і польскіх гісторыкаў, а таксама вывучэння архіўных крыніц, многія з якіх упершыню ўводзяцца ў навуковы зварот.

The scientific article is devoted to the development of pottery handicrafts in a small townships of Polesie Voivodeship. The pottery handicrafts in Gorodnaja was a was a very ancient craft, and often experience handed down from generation to generation. This article was written by native and foreign literature and archival sources, many of whom first appeared in the scientific.

Развіцце рамяства ў мястэчках Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. можна разглядаць як прамежкавую форму паміж саматужнымі сялянскімі промысламі і мануфактурамі, фабрычнай прамысловасцю, якая развівалася ў гарадах. У Польшчы ў 20-30-я гг. XX ст. пад саматужнымі промысламі прынята было разумець рамесніцтва, розныя віды вырабаў, прызначаныя на продаж і на заказ [1, с. 31].

Ганчарства з'яўлялася адным з самых старажытных традыцыйных мастацкіх промыслаў Беларусі. І местачковая народная культура ў развіцці гэтага промыслу мела немала дасягненняў. Польскія ўлады былі зацікаўлены ў плённым развіцці гэтай галіны культуры. Закон аб народных промыслах у ІІ Рэчы Паспалітай быў прыняты Сеймам 31 ліпеня 1924 г., на падставе якога гэта галіна народнай гаспадаркі пачала атрымліваць урадавыя фінансавыя субсідыі [1, с. 79]. З 1918 г. у складзе Міністэрства прамысловасці і гандлю дзейнічаў аддзел народных промыслаў, з дапамогай якога ў 20-я гг. XX ст. былі створаны 4 таварыствы дапамогі народным промыслам у Вільні, Навагрудку, Брэсце, Беластоку, якія наладжвалі выставы і кірмашы ў многіх мястэчках Заходняй Беларусі.

Мястэчка Гарадная яшчэ ў канцы XIX ст. стала буйнейшым у Беларусі цэнтрам ганчарства па колькасці вырабляемай прадукцыі і рынкаў яе збыту. Сваю асаблівую спецыялізацыю ў развіцці рамяства гэта мястэчка захавала і ў 20-30 гг., выступаючы адзіным цэнтрам вытворчасці белаглінянай керамікі ў межах Палесся. У 1921 г. у мястэчку Палескага ваяводства налічвалася 2597 жыхароў, 459 будынкаў і 10% насельніцтва займалася ганчарным промыслам [9, с. 302]. Даследчык мастацкай культуры Беларусі Я.М. Сахута адзначыў, што у мястэчку ў 20-х гг. была рэкордная колькасць ганчароў – 500 [4, с. 231]. Развіццю гэтага промыслу ў значнай ступені садзейнічалі багатыя залежы высокаякаснай ганчарнай гліны. Аб значнасці ганчарнага промыслу сведчыў той факт, што дзяўчаты з Гараднoй адмаўляліся выходзіць замуж за хлопцаў, якія не ўмелі працаваць на ганчарным крузе [6, с. 14]. Гэта сведчыла аб тым, што ганчарны промысел быў асноўным відам заробку і стаў патомным для многіх гараднянскіх ганчароў.

У мястэчку налічвалася 215 майстэрань, дзе, акрамя саміх ганчароў, працавала 40 членаў іх сямей [1, с. 231]. Аднак па прычыне канкурэнцыі, колькасць ганчароў у 30-я гг. значна зменшылася. Па архіўных звестках за 1935 г. у мястэчку іх налічвалася каля 300 [3, л. 25]. Становішча ганчароў было цяжкім, умовы жыцця і працы амаль першабытнымі. Да канца XIX ст. ганчары Гараднoй выкарыстоўвалі ручную лепку, як спосаб вытворчасці ганчарных вырабаў. У 20-я гг. у мястэчку стаў актыўна выкарыстоўвацца нажны ганчарны круг з рухомай воссю, што дазволіла майстрам рабіць разнастайнымі па форме ганчарныя вырабы [2, с. 67]. Мастацкія якасці вырабаў у значнай ступені вызначаліся характарам апалу і спадарожных яму аперацый. Дарэчы, печы для апальвання посуду (гароны) былі амаль у кожнай гараднянскай сям’і [3, л. 2]. З 30-х гг. гараднянскія майстры сталі прымяняць новы спосаб апрацоўкі керамічных вырабаў – глазураванне з дапамогай палівы (эмаліраванне) і аздаблялі свой посуд. Польская даследчыца народных промыслаў у Заходняй Беларусі Я. Арынжына адзначыла: “Формы гараднянскага посуду захоўваюць даўнія традыцыі і аздоблены арнаментам з чырвонай жалезістай гліны (апіскі) па неглазураванай паверхні, якая пасля абпалу становіцца крэмава-белай” [8, с. 19]. Таму Гарадная становіцца адзіным цэнтрам на Палессі па вырабу белаглінянай керамікі, саступаючы толькі некалькім ганчарным цэнтрам Валыні і Сярэдняга Падняпроўя [4, с. 111].

Удасканальванне тэхнікі ганчарных вырабаў наклала свой адбітак на працэс арганізацыі збыту гараднянскіх тавараў. Пакутавалі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

гараднянскія ганчары ад перакупшчыкаў, якія значна зніжалі іх заробкі. Амаль увесь гандаль знаходзіўся ў руках мясцовага яўрэйскага насельніцтва, якое складала 15% ад усіх жыхароў Гарадной. Існавала нават асаблівая форма пасрэдніцтва паміж ганчаром-вытворцам і пакупніком – дапрацоўка непаліваных гараднянскіх вырабаў з мэтай надання ім палівы з наступным продажам па значна больш высокай цане. Гэтым займалася мясцовая картэль перакупшчыкаў, якія мелі ўласныя печы для апалу з палівай і эксплуатавалі гараднянскіх ганчароў. За гаршчок, які каштаваў 20 грошай, ганчар атрымоўваў 3 грошы. За дзень адна сям'я магла вырабіць каля 40 гаршкоў, пры гэтым яе агульны заробак складаў не больш аднаго злотага. Гараднянскія ганчары вымушаны былі яшчэ плаціць за гліну, бо не мелі ўласных зямельных надзелаў, што таксама зніжала іх заробкі [7, с. 55]. У 1935 г. толькі 18 ганчароў самі выраблялі і эмаліравалі свой посуд [3, л. 17]. Часта ганчары мянялі свой непаліваны посуд на эмаліраваны, бо паліва каштавала вельмі дорага: 15 злотых на 300-400 адзінак посуду. Воз паліванага посуду (400 адзінак) каштаваў – 40-50 зл., непаліванага – 12-14 зл. [3, л. 17 зв.]. Адсюль з'явілася яшчэ адна катэгорыя ганчароў, якіе не займаліся вырабам посуду, а толькі яго эмаліроўкай. У 1935 г. такіх ганчароў у Гарадной было 12 [3, л. 17 зв.].

Высокія тэхналагічныя якасці гараднянскай керамікі ведалі на Палессі, у Цэнтральнай Беларусі, трапляла яна і на Валынь, у Кіеў, Вільню, Варшаву. У Вільні гараднянскую кераміку называлі целяханскай (па аналогіі з шырока вядомым целяханскім фаянсам). Уладальнікі ювелірных фабрык ведалі яе высокую тэрмічную ўласцівасць і ахвотна набывалі для выплаўкі каштоўных металаў [4, с. 110]. Канкурэнцыю гараднянскім састаўлялі толькі ганчары Дубовіцкага раёна [5, с. 97]. Прыхільна да ганчароў ставіўся і падтрымліваў іх палескі ваявода Младзяноўскі. Дзякуючы яму, гараднянцы атрымалі магчымасць гандляваць сваімі вырабамі ў прыгранічнай зоне, якая спакон веку была месцам збыту гараднянскай керамікі. Самы вялікі попыт на прадукцыю ганчароў існаваў вясной і напачатку лета – у сезон малака [1, с. 231].

Асартымент гараднянскага посуду быў разнастайны: гаршкі, глечыкі, гладышкі, міскі, тарэлкі, кубачкі, макотры, формы для выпечкі, цадзілкі, барылкі, чайнікі, букетнікі, румкі, вазоннікі. Гараднянскі ганчарны посуд адрозніваўся ўстойлівасцю, ураўнаважанай, яснай выразнай формай. Найбольш разнастайнымі па форме былі міскі: лаханка, польская міска, паўмісак, варэнька, гарнал, рандэлька і інш. Амаль увесь гараднянскі посуд быў распісны. Роспіс наносіўся курынымі ці гусінымі пер'ямі ("пёрцам") адразу пасля



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

фармоўкі на ганчарным крузе ў выглядзе адводак, розных штрыхоў чырвонай глінай (апіскай). Характар арнаменту быў невыяўленчы і вызначаўся спосабам вярчэння пасудзіны вакол вертыкальнай восі. Роўныя палоскі-адводкі называліся паясамі, хвалістыя – малюнкамі, а сакавітыя мазкі паверх адводак – кветкамі. Часам нажом або калёсікам з насечкамі наносіліся "рубежыкі" ці хвалістыя лініі. Аднак, глазураванне (паліванне) посуду значна зніжала тэрмічную яго ўстойлівасць. Часам, каб засцерагчы крохкі эмаліраваны посуд ад пашкоджанняў, ганчары абплятаалі яго дротам [5, с. 98].

Працэс вытворчасці ганчарных вырабаў складаўся з некалькіх этапаў: падрыхтоўка гліны, выраб прадукта, сушка і апальване посуду, а таксама яго аздабленне. Прывезеную ў ганчарку (майстэрню па вытворчасці ганчарных вырабаў) гліну гараднянцы збівалі, змочвалі ў вадзе і ўкрывалі на некаторы час для разбухання. Потым рыхтавалі гліну для фармоўкі: пераміналі рукамі, выкідвалі каменне і смецце, збівалі. Працэс вытворчасці аднаго вырабу на ганчарным крузе ў майстра займаў каля трох хвілін. Гэта сведчыла аб сапраўды прафесійным узроўні гараднянскіх ганчароў, які падпітваўся шматвекавым вопытам і ўстойлівымі патомнымі традыцыямі. Гатовыя вырабы падсушвалі, падпраўлялі і раўнялі, а потым ставілі для сушкі на 10-12 дзён. Высушаны посуд распісвалі ці аблівалі палівай і апальвалі ў горнах (ганчарных печах) [5, с. 100-101].

Многія мястэчковыя ганчарныя цэнтры ў Заходняй Беларусі былі ўзяты пад апеку Варшаўскім таварыствам. Мястэчка Гарадная не было выключэннем. Да канткрэтных спраў дапамогі ганчарам далучыліся Палескае ваяводства і мясцовыя ўлады. У 1929 г. Польскі саюз сельскагаспадарчых гандлёвых кааператываў прыкладаў намаганні, каб залажыць у Гараднoй ганчарны кааператыў. Павятовы сеймік пры дапамозе Варшаўскага таварыства падтрымкі народных промыслаў пабудаваў на ўласныя сродкі ўдасканаленую печ для апалу посуду і накіраваў на спецыяльныя курсы ў Вішнева на керамічную станцыю двух найбольш здольных гараднянскіх ганчароў, дзе яны павінны былі навучыцца тэхналогіі паліўной керамікі. Аднак ганчары Гараднoй не жадалі працаваць калектыўна [1, с. 232]. Няўдалай была спроба наладзіць у Гараднoй выраб кафлі, што магло палепшыць матэрыяльнае становішча гараднянцаў. Мясцовая гліна аказалася непрыдатнай для вырабу кафлі. Майстры выраблялі ў сярэднім ад 100 да 150 штук кафлі, што было нязначным, каб наладзіць працэс вытворчасці [3, л. 2]. У 20-я гг. была наладжана выстаўка народных промыслаў у Брэсце, ў 1929 г. – у Познані, дзе высокую ацэнку атрымаў белагліняны посуд з Гараднoй [4, с. 100].

У 1926 г. быў заснаваны палескі музей у Пінску, цэнтральнае месца ў этнаграфічных зборах якога займала калекцыя гараднянскай керамікі. Першыя экспанаты падаравалі музею з нагоды яго адкрыцця самі ганчары-гараднянцы. У асноўным калекцыя фарміравалася ў 1928 – 1929 гг. Вялікую калекцыю керамікі падараваў музею ганчар з Гарадной − Павел Вячорка. У 1930 г. калекцыя палескага музея налічвала некалькі дзесяткаў узораў гараднянскай керамікі. У ей былі прадстаўлены збаны, слоікі, гаршкі, міскі, кубкі, талеркі, формы для булак, хлебніцы, сальнічкі, падстаўкі для яек, кубачкі, масленкі з накрыўкай, якія ўяўлялі сабою традыцыйныя ганчарныя вырабы і спробы прыстасавання гараднянскага посуду да гарадскога спажыўца [1, с. 330].

Ганчарства ў Гарадной прадстаўляла сабою народны промысел, які ў 20-30-я гады XX ст. набыў новае жыццё і значна пашырыўся ў сувязі з агульнай зацікаўленасцю грамадства ў народным мастацтве і ўвагі да яго мясцовых традыцый. На прыкладзе развіцця ганчарнай вытворчасці ў мястэчку Гарадная можна прасачыць, наколькі living рознабаковай і багатай была традыцыйная мастацкая местачковая культура і наколькі значны яе ўклад у агульнабеларускую скарбніцу мастацтва.

## ЛІТАРАТУРА


1. Лабачэўская, В.А. Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В.А. Лабачэўская. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 375 с.
2. Милюченков, С.А. Белорусское народное гончарство / С.А. Милюченков. – Минск: “Беларусь”, 1984. – 183 с.
3. Государственный архив Брестской области (ГАБО) – Ф.1. - Оп.1. - Д.443. Переписка со Столинским поветовым старостовом Брестской ремесленной палатой об организации ремесел гончарного, кирпичного в Городно и сапожного в Давид-Городке, 1935 г.
4. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М. Сахута. – Мінск: “Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі”, 1997. – 288 с.
5. Угринович, В.В. Гончарный промысел деревни Городная / В.В. Угринович. // Вопросы культуры и искусства Белоруссии – Минск, 1987. – с. 95 – 101.
6. Шаўцова, М. Чым заклапочаны майстры з Гараднай… / М. Шаўцова. // Літаратура і мастацтва – 1982. – 23 ліпеня. – с. 14.
7. Giorgiewski, D. Ganczarstwo poleskie / D. Giorgiewski. // W poleskiej kniej. - Pińsk, 1938. – 29 s.
8. Orynżyna, J. Przemysł ludowy w województwach Wileńskim, Nowogrodskim, Poleskiem i Wołynskiem / J. Orynżyna. – Warszawa, 1927. – 46 s.
9. Skorowidz miejscowosci Rzeczypospolitej Polskiej. Województwo Poleskie: nakladem głownego urzędu statystyczhego. – Tom 8. – Warszawa. – 1924. – 84 s.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ